48

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ “ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ П.М. МАШЭРАВА”

Гістарычны факультэт

Кафедра гісторыі Беларусі

Дапушчана да абароны

“14” 02 2020 г.

Загадчык кафедры

А.М. Дулаў

МАГІСТАРСКАЯ ДЫСЕРТАЦЫЯ

# “БЕЛАРУСКАЯ ТРАДЫЦЫЙНАЯ ВЯСЕЛЬНАЯ І РАДЗІННА-ХРЭСЬБІННАЯ АБРАДНАСЦЬ НА ПОЎНАЧЫ МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ”

Спецыяльнасць: 1-21 80 16 Айчынная гісторыя

**Кроцікава Марыя Валер’еўна,**

магістрант 2 курса

Навуковы кіраўнік:

**Цімафееў Расціслаў Уладзіміравіч**:

кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Віцебск, 2020

# РЭФЕРАТ МАГІСТАРСКАЙ ДЫСЕРТАЦЫІ

Магістарская дысертацыя: 104 старонкі, 4 дадаткі, 61 крыніца, архіў аўтараў – 8

Ключавыя словы: БЕЛАРУСКАЯ ТРАДЫЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА, СЯМЕЙНАЯ АБРАДНАСЦЬ, ТРАДЫЦЫІ, ЗВЫЧАІ, РЫТУАЛЫ, ВЕРАВАННІ, ВЯСЕЛЛЕ, РАДЗІНЫ, ХРЭСЬБІНЫ, МАЛЕНСТВА

**Аб'ектам даследавання** выступаюць прадстаўнікі беларускага этнасу, якія пражываюць у сельскай мясцовасці і не страцілі сваіх ведаў пра беларускія традыцыйныя сямейныя абрады і звычаі.

**Прадмет даследавання:** беларускія традыцыйныя абрады, звычаі, вераванні вясельнай і радзінна-хрэсьбіннай абраднасці паўночнага рэгіёну Магілеўскай вобласці.

**Мэта даследчай работы**: выявіць, вывучыць і ахарактарызаваць асаблівасці вясельных і радзінна-хрэсьбінных абрадаў, вызначыць агульныя і адметныя асаблівасці на прыкладзе матэрыялаў поўначы Магілеўскай вобласці.

**Крыніцамі** дысертацыйнага даследавання з'яўляюцца матэрыялы этнаграфічных экспедыцый, праведзеных на Шклоўшчыне, матэрыялы перыядычнага друку, публіцыстыка.

**Метады даследавання:** у якасці тэарэтыка-метадалагічнай асновы даследавання былі выкарыстаны комплекс метадаў гістарычнай навукі: гісторыка-сістэмны, гістарычна-генетычны структурна-функцыянальны; параўнальна-гістарычны ці кампаратыўны метад, метад палявых этнаграфічных даследаванняў (апытанне) і канструктыўны дыялог. Выкарыстаны комплексны падыход, калі мае месца не толькі пераапрацоўка і аналіз існуючых літаратурных крыніц, але і канструктыўны дыялог з непасрэднымі ўдзельнікамі сямейных абрадаў і рытуалаў.

Праца напісана з пазіцый гістарызму, навуковасці, аб'ектыўнасці, сістэмнасці як галоўных метадалагічных прынцыпаў, якія даюць магчымасць ўсебакова прааналізаваць развіцце і асаблівасці вясельнай і радзінна-хрэсьбіннай абраднасці на паўначы Магілёўскай вобласці.

**Актуальнасць работы**: вясельныя і радзінна-хрэсьбінныя абрады застаюцца самым папулярнымі і самымі важнымі рытуаламі жыцця сучасных беларусаў. Аднак, гэтыя абрады сёння перажываюць розныя змены: светапогляднага, структурнага, ідэалагічнага характару. Таму даследаванне абрадаў і звычаяў, звязаных з вяселлем, радзінамі і хрэсьбінамі падобнага роду ўяўляецца вельмі своечасовым.

**Элементы навуковай навізны:** праведзены падрабязны структурна-функцыянальны аналіз вясельных і радзінна-хрэсьбінных абрадаў на поўначы Магілеўскай вобласці, прааналізаваны падабенствы і адрозненні сучаснага і традыцыйнага вяселля ў дадзеным рэгіёне.

**Тэарэтычная значнасць:** праведзеная праца дазволіць змястоўна звярнуць увагу грамадства на выпрацоўку неабходных падыходаў па захаванні традыцыйнай абраднасці беларусаў

у перыяд супярэчлівай і пагрозлівай для нацыянальных культур глабалізацыі. У выніку чаго, у традыцыйнай культуры павялічацца шанцы ў напрамку захавання нацыянальнай ідэнтычнасці і паглыблення нацыянальнай самасвядомасці.

**Практычная значнасць:** матэрыялы даследавання могуць выкарыстоўвацца пры паглыбленым вывучэнні сямейнай абраднасці ў рэгіёнах Магілеўшчыны. Вынікі даследавання будуць актуальны ў сферы пашырэння і прапаганды беларускіх нацыянальных традыцый праз рэканструкцыі сямейных абрадаў на Шклоўшчыне, пры падрыхтоўцы і правядзенні ўрокаў гісторыі і краязнаўства, стварэнні падручнікаў, метадычных дапаможнікаў і вучэбных праграм. Матэрыялы з дадзенага даследавання выкарыстоўваліся пры распрацоўцы цыкла інтэрактыўных заняткаў "З крыніц спрадвечных" для вучняў УА "Гімназія № 1 г. Віцебска імя Ж. І. Алферава", а таксама пры арганізацыі дабрачынных мерапрыемстваў па вывучэнні беларускай традыцыйнай культуры ва УК "Шклоўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей".

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

1. Международная научно-практическая конференция студентов, аспирантов и молодых ученых "XII Машеровские чтения", ВГУ имени П. М. Машерова, Витебск, 19 октября 2018 г.;

2. Международная научная конференция "Романовские чтения – 12", посвященная 105-летию МГУ имени А. А. Кулешова, Могилев, 25-26 октября 2018 г.;

3. Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Капыцінскія чытанні-3", МДУ імя А. А. Куляшова, 28 лютага – 1 сакавіка 2019 года, Магілёў, 2019 г.;

4. Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Куляшоўскія чытанні", МДУ імя А. А. Куляшова, Магілеў, 18 – 19 красавіка 2019 г.;

5. VII Международная научно-практическая конференция студентов и магистрантов "Молодость. Интеллект. Инициатива", ВГУ имени П. М. Машерова, Витебск, 18 апреля 2019 г.;

6. V Республиканская научно-практическая конференция "Научно-методическое сопровождение повышения квалификации педагогов: опыт, проблемы, перспективы", МГОИРО, г. Могилёв, 17 мая 2019 г.;

7. Международная научно-практическая конференция студентов, аспирантов и молодых учёных "XIII Машеровские чтения", ВГУ имени П. М. Машерова, Витебск, 18 октября 2019 г.;

8. Международная научная конференция "Романовские чтения-3", МГУ имени А. А. Кулешова, Могилев, 28 – 29 ноября 2019 г.

**Асабісты ўклад магістранта:** дысертацыя з'яўляецца самастойным даследаваннем і змяшчае вынікі, атрыманыя на падставе ўласнага аналізу. Усебакова прасочана эвалюцыя вясельных і радзінна-хрэсьбінных абрадаў на поўначы Магілеўскай вобласці ў канцы XX – пачатку XXI ст. На аснове комплексу крыніц вызначаны фактары эвалюцыі, прасочана дынаміка і

раскрыты асноўныя напрамкі змен у сямейнай абраднасці беларусаў, ахарактарызаваны яе сучасны стан, выяўлены лакальныя адрозненні і асаблівасці. У дысертацыі выкарыстаны матэрыялы, зафіксаваныя магістрантам у ходзе палявых этнаграфічных экспедыцый, праведзеных на тэрыторыі Шклоўскага раёна ў 2017 – 2019 гг.

Аўтар працы падцвяржае, што прыведзены аналітычны матэрыял правільна і аб'ектыўна адлюстроўвае стан даследуемай праблемы, а ўсе запазычаныя з літаратурных крыніц тэарэтычныя, метадалагічныя палажэнні і канцэпцыі суправаджаюцца спасылкамі на іх аўтараў.

Крошкава М.В.

(Прозвішча, імя, імя па бацьку)

(подпіс магістранта)

**Змест**

Уводзіны.........................................................................................6

1 Гістарыяграфія, крыніцы і метады даследавання..............................13

1.1 Гістарыяграфія...............................................................................13

1.2 Крыніцы .........................................................................................17

1.3 Метады даследавання....................................................................24

2 Структурныя асаблівасці перадвясельнага этапу на поўначы Магілёўскай вобласці.......26

2.1 Выбар часу, спрыяльнага для сватаўства. Асноўныя ўдзельнікі абраду і іх роля.........26

2.2 "Дзявочы" і "Хлапечы" вечары. Сімволіка вясельных атрыбутаў: іх выраб і сакральнае значэнне.....................................................................................................31

2.3 Вясельны каравай – сімвал яднання і працягу роду: паслядоўнасць абрадавых дзеянняў.....................................................................................................36

3 Вясельны і паслявясельны этапы.......................................................40

3.1 Зборы жаніха і нявесты: асаблівасці і паслядоўнасць правядзення рытуальных дзеянняў.....................................................................................................40

3.2 Сустрэча маладых. Вясельнае застолле: рытуальная ежа і рэгламентацыі паводзін за святочным сталом.....................................................................................42

3.3 Вясельныя песні Шклоўшчыны: іх месца і роля ў сямейна-абрадавым комплексе. Наведванне бацькоў маладых як заключны кампанент паслявясельнага этапу..............45

4 Радзінна-хрэсьбінная абраднасць на поўначы Магілеўскай вобласці: звычаі, абрады, вераванні.....................................................................................................49

4.1 Абрадава-этыкетная рэгламентацыя паводзінаў цяжарнай жанчыны........................49

4.2 Радзінныя звычаі і абрады, звязаныя з нараджэннем дзіцяці...................................55

4.3 Рытуальныя дзеянні і рэгламентацыя паводзінаў сям'і ў першыя дні жыцця дзіця.......59

4.4 Звычаі і абрады, якія папярэднічалі хрышчэнню. Святкаванне хрэсьбін. Звычаі і абрады прыняцця нованароджанага ў сям'ю.............................................................64

4.5 Першыя гады немаўляці: першы зуб, першы крок, першае пастрыжэнне.................70

Заключэнне.......................................................................................74

Спіс выкарыстаных крыніц.................................................................80

Дадаткі.............................................................................................84

**Уводзіны**

У сучаснай Рэспубліцы Беларусь дзяржава надае значную ўвагу вырашэнню праблемы дэмаграфічнай бяспекі. У гэтым напрамку ўлады выкарыстоўваюць як сродкі матэрыяльнага так і маральнага характару, накіраваныя на ўмацаванне сучаснага стану беларускай сям'і. Яе значнасць як сацыякультурнага інстытута грамадства вызначаецца той роляй, якую яна выконвае па забеспячэнні бесперапыннага ўзнаўлення новых пакаленняў, вырашэнні дэмаграфічных праблем. Для таго каб сям'я магла выканаць гэтую важнейшую місію, яна павінна быць устойлівай супольнасцю, здольнай да захавання жыцця, захавання лепшых дасягненняў у матэрыяльнай, духоўнай і сацыяльнай культуры. Сям'я як грамадскі інстытут адлюстроўвае дзяржаўныя інтарэсы, лад жыцця. Маральныя ўстоі павінны спрыяць захаванню дэмаграфічнай бяспекі ў краіне, быць гарантам сацыяльнай устойлівасці, кансалідацыі дзяржаўных намаганняў па забеспячэнні высокага ўзроўню жыцця.

Значныя спадзяванні ў стварэнні, ўмацаванні сям'і дзяржава звязвае з захаваннем традыцыйных народных абрадаў і звычаяў, у першую чаргу вясельных і радзіннахрэсьбінных. Тым больш, што ў апошнія гады, дзякуючы нацыянальнаму адраджэнню, у беларусаў узнікла цікавасць да свайго мінулага, да найбольш яркай, эмацыянальна насычанай культуры – духоўнай.

Адной з мэтаў сучаснай беларускай дзяржаўнай палітыкі ў развіцці нацыянальнай культуры з'яўляецца захаванне гісторыка-культурнай спадчыны, стварэнне ўмоў для ўсебаковага развіцця асобы, росту яе творчай ініцыятывы, духоўных і эстэтычных патрэбаў, што немагчыма без выкарыстання традыцыйных абрадаў і звычаяў.

Нацыянальная культура павінна павысіць ролю асобы як галоўнай рухаючай сілы новага постіндустрыяльнага грамадства. Культываванне вывучэння, захавання і прапаганды нацыянальна-гістарычнай спадчыны з'яўляецца жыватворным сродкам абагачэння нацыянальнай самасвядомасці. У гэтым удзельнічаюць ўсе грамадскія інстытуты, якія валодаюць выхаваўчым уздзеяннем (сям'я, сістэма адукацыі, культура і інш.). Сённяшняе нацыянальна-культурнае адраджэнне Беларусі спрые абуджэнню ў людзей цікавасці да лёсу сваёй краіны. Тым больш, што гісторыя беларускіх зямель і народа цікавая і багатая на падзеі. Вывучаючы традыцыі краіны, вядомыя і малазнаемыя старонкі яе жыцця мы пракладваем шлях у будучыню.

Сямейныя абрады і звычаі звязаны з найбольш важнымі момантамі жыцця чалавека: народзінамі і шлюбам. Значнасць гэтых падзей жыццёвага цыкла ў далёкай старажытнасці спрыяла іх дэталёваму абрадаваму афармленню, ў выніку чаго гістарычна замацаваліся ў выглядзе самастойных рытуальных з'яў. У цэлым, гэта складаная дынамічная сістэма, якая адлюстроўвае важны бок духоўнай культуры народа ў яе ўзаемасувязі з матэрыяльнай культурай і сацыяльнай структурай грамадства. Сямейныя рытуалы аб'ядноўваюць у адзіную лагічную структуру з'явы, розныя па сваёй прыродзе: кампаненты матэрыяльнай культуры, абрадавыя дзеянні і фальклор. У

гэтых рытуалах адлюстраваны традыцыйныя погляды народа, іх вывучэнне дапамагае глыбей пранікнуць у гісторыю развіцця нацыянальнай культуры. Традыцыйныя сямейныя звычаі і абрады - гэта, нарэшце, тая галіна духоўнага жыцця беларусаў, дзе ўстойлівыя традыцыі працягваюць жыць. Трэба адзначыць, што сямейныя абрады эвалюцыянавалі, але захавалі рысы традыцыйнай культуры. Яны вызначаюцца нацыянальнай і рэгіянальнай адметнасцю, разнастайнасцю тэматыкі, добрай захаванасцю ў рэгіенах Беларусі.

Падрыхтаваць даследаванне, звязанае з беларускай традыцыйнай вясельнай і радзіннахрэсьбіннай абраднасцю (на прыкладзе матэрыялаў даследавання поўначы Магілёўскай вобласці) мяне падштурхнулі разважанні над шляхамі яе трансфармацыі ў сучасных сацыякультурных умовах. Сёння працэсы глабалізацыі ахапілі ўсе сферы жыцця нашага грамадства, немінуча ўцягнулі ў свой нястрымны вір духоўна-маральныя каштоўнасці беларусаў.

Магутнымі і супярэчлівымі фактарамі глабалізацыі ў сучасных умовах з'яўляюцца тэлебачанне і інтэрнэт, якія ўсе больш фарміруюць грамадскую свядомасць, што не абыйшло і традыцыйнае беларускае вяселле і абрады, звязаныя з нараджэннем дзіцяці. З умацаваннем працэсаў глабалізацыі захаванне традыцыйнай культуры беларусаў будзе ўсе больш і больш праблемным. Аб гэтым сведчыць тое, што да нядаўняга часу традыцыі мінулага забываліся хуткімі тэмпамі, іх выкарыстанне ў жыцці насельніцтва ўсе больш і больш змяншалася. Але ў цяперашні час увага да традыцыйнай культуры ўзрастае. Узрасла цікавасць шырокіх слаёў насельніцтва да нацыянальнай культурнай спадчыны, да традыцыйных форм культуры і быту. Гэта даказвае, што вывучэнне традыцый патрабуюць не толькі навуковыя інтарэсы, але як сацыяльныя, так і духоўныя патрэбы грамадства.

У духоўнай культуры вялікую ўвагу не без падстаў выклікае сямейная абраднасць, а ў ей традыцыі вяселля, якое складаецца з паслядоўных этапаў, кожны з якіх выконвае сваю асабліваю ролю, мае дакладнае значэнне. У нашы дні вяселле святкуецца інакш, чым некалькі стагоддзяў таму. Сёння вяселле - гэта афіцыйнае ўзаконьванне шлюбу, гэта рэгістрацыя, а не старадаўні абрад, на жаль. Можна правесці паралель і паглядзець наколькі далёка грамадства адышло ад старадаўніх традыцый.

Сёння вясельная ўрачыстасць для ўсіх зацікаўленых асоб - перш за ўсё падзея сацыяльна-эканамічнага характару: у залежнасці ад сямейнага дастатку вызначаецца месца яго правядзення і колькасць гасцей. Аднак вяселле тым і адрозніваецца ад іншых урачыстасцяў, што яно, як правіла, павінна збіраць за адным сталом перш за ўсё прадстаўнікоў абодвух Радоў, усіх тых, хто меў непасрэднае дачыненне да духоўнага станаўлення дачкі і сына: бабка-павітуха, хросныя бацькі, сваты, сваякі, сябры з абодвух бакоў. Гэта, прынамсі, дапамагае ўмацаванню сямейных адносін, таму як у крызісныя моманты сямейнага жыцця есць магчымасць звярнуцца да іх за падтрымкай і парадамі.

Паслявясельны этап развіцця сямейных адносін ўключаў у сябе радзінныя звычаі і абрады, якія складаліся з трох звязаных паміж сабой цыклаў: дародавы, родавы, пасляродавы.У дародавы і родавы цыкл ўваходзілі павер'і, звычаі, уяўленні, абрадавыя дзеянні, накіраваныя на захаванне цяжарнасці і яе паспяховае завяршэнне. Пасляродавы перыяд меў мэту прыняцця немаўляці ў сям'ю. Ён складаўся са звычаяў і абрадаў імянаречэння дзіцяці, наведвання парадзіхі і дзіця, выбару кумоў, а таксама абрады хрэсьбін і першага пастрыжэння дзіцяці. У цэлым, гэты абрадавы комплекс быў накіраваны на забеспячэнне, абарону народжанага ад няшчасцяў, на падрыхтоўку яго да дарослага жыцця.

Традыцыйная радзінна-хрэсьбінная абраднасць беларусаў – неад'емная частка народнага побыту, сямейнага ўкладу, духоўнай культуры народа, яго светавызначэння, этыкі і эстэтыкі. Трэба адзначыць, што абрады і звычаі, звязаныя з нараджэннем дзіцяці, узніклі раней, чым вясельныя. Аднак і яны пацярпелі пэўныя змены. Станаўленне і функцыянаванне гэтай складанай культурна-гістарычнай з'явы было абумоўлена заканамернасцямі сацыяльна-гістарычнага развіцця і этнічнай традыцыяй. Радзінна-хрэсьбінныя звычаі і абрады аб'ядноўвалі сям'ю, служылі своеасаблівым механізмам для перадачы этнічных традыцый, маральна-этычных норм і прынцыпаў ад старэйшых да малодшых. Яны дапамагалі кожнай асобнай сям'і адзначыць такія радасныя і важныя падзеі як нараджэнне дзіцяці, вяселле, наваселле, ці зняць эмацыйна-псіхічнае напружанне ў выпадку смерці блізкіх людзей.

У канцы XIX - пачатку XX стст. агульны комплекс радзінна-хрэсьбінных звычаяў і абрадаў беларусаў заставаўся даволі кансерватыўнай часткай жыцця народа. У ім разам існавалі, і магічныя прыёмы, і рацыянальныя элементы, і царкоўныя кампаненты. Вялікае месца ў сямейным побыце беларускага народа ў канцы XIX - пачатку XX стст. займалі звычаі, абрады, павер'і звязаныя з цяжарнасцю жанчыны і нараджэннем дзіцяці. У іх захоўваліся перажыткі ўсіх стадый развіцця чалавечага грамадства і яго рэлігійныя вераванні, адлюстраванне шматвяковых народных медыцынскіх ведаў, светаўспрымання, маральныя нормы і каштоўнасці.

Нараджэнне і выхаванне дзяцей ў беларускага народа былі натуральным і галоўным прызначэннем сям'і. У народнай культуры дзеці спрадвечна лічыліся Божым дарам, дабраславеннем сям'і, былі ўвасабленнем шчасця, з імі звязваліся надзеі на бессмяротнасць - прадаўжэнне роду. Нашы продкі, у якіх не было магчымасці вучыцца ні ў педагагічных, ні ў медыцынскіх, ні ў якіх-небудзь іншых навучальных установах, тым не меней добра разумелі працэсы фізічнага, псіхалагічнага, эмацыянальнага, разумовага развіцця дзіцяці, асаблівасці кожнага з этапаў яго сталення. Пазней эмпірычныя народныя веды беларусаў былі пацверджаны афіцыйнай педагагічнай навукай.

Так, ва ўяўленнях нашых продкаў найбольш адказным перыядам у развіцці дзіцяці лічылася ранняе маленства - час ад нараджэння да 2-3 гадоў. Таксама ў традыцыйнай культуры захавалася

шмат прыкладаў усведамлення нашымі продкамі ўзаемасувязі паміж усім жывым на зямлі, у адпаведнасці з чым дзіця разглядалася як неад'емная частка прыроды і Сусвету. Традыцыя прадпісвала будучым бацькам ужо на этапе зачацця і цяжарнасці клапаціцца не толькі аб фізічным здароўі дзіцяці, але і аб забяспячэнні шчаслівага лёсу для яго, аб развіцці духоўна-маральных пачаткаў. Згодна з народнымі ведамі і вераваннямі, лёс, характар, знешнасць чалавека былі абумоўлены абставінамі, якія папярэднічалі зачаццю, і паводзінамі маці ў час цяжарнасці. Час, калі дзіця знаходзілася ва ўлонні маці, справядліва лічыўся базай фарміравання будучай асобы, якая адпавядала б ідэалу чалавека ў дадзеным грамадстве.

У сувязі з гэтым існаваў цэлы звод прадпісанняў і забаронаў, накіраваных на ахову плода ва ўлонні маці. Нашы продкі былі перакананы, што ўсе ўражанні і перажыванні будучай маці прама або ўскосна адаб'юцца на дзіцяці. Таму для цяжарнай жанчыны лічылася надзвычай карысным захоўваць добры настрой, часцей глядзець на што-небудзь прыгожае. Сёння шматлікімі навуковымі даследаваннямі пацверджана, што гэты перыяд надзвычай важны для далейшага жыцця чалавека: менавіта ў гэты час закладваюцца асноўныя структуры арганізма, і любое негатыўнае ўздзеянне можа нанесці вялікую шкоду фізічнаму і псіхічнаму здароўю дзіцяці.

Вельмі важным быў сам момант нараджэння дзіцяці, з'яўлення на свет, калі, паводле традыцыйных вераванняў, вызначаўся ўвесь далейшы лёс чалавека, на які, акрамя звышнатуральных сіл, маглі паўплываць разнастайныя абрадава-магічныя дзеянні, слоўныя формулы, прадметы-сімвалы, якія выкарыстоўвалі павітуха, бацькі, родныя. Праграмаванне ўсяго далейшага жыццёвага шчаслівага лёсу дзіцяці з усімі яго складнікамі: моцнае здароўе, дабрабыт, удалы шлюб, станоўчыя маральныя якасці характару, прыгожая знешнасць - у беларусаў у мінулым пачыналася задоўга да нараджэння і вельмі актыўна ажыццяўлялася ў першыя хвіліны, дні і месяцы жыцця.

Сям'я была першай школай, дзе дзеці спасцігалі ўрокі роднай мовы і мыслення, духоўна-маральных нормаў чалавечых узаемаадносін, засвойвалі навыкі самаабслугоўвання і працы, арыентацыі ў навакольным асяроддзі. У перыяд ранняга маленства дзіця знаходзілася пад апекай маці, якая яго карміла, даглядала, песціла. Цесныя кантакты маці з дзецьмі з самага нараджэння стымулявалі і эмацыянальна цёплы клімат зносін паміж імі ў многіх пакаленнях беларусаў. Адносіны паміж маці і дзіцем - гэта цэлы комплекс розных па сваёй прыродзе кампанентаў, абумоўленых як біялагічнымі, фізіялагічнымі, псіхалагічнымі, так і соцыякультурнымі фактарамі. На працягу стагоддзяў у беларускага народа фарміраваліся уяўленні пра мацярынства як жаночую сацыяльную ролю, што прадугледжвала канкрэтныя правілы, нормы, формы зносін маці і дзіцяці, метады і сродкі сацыялізацыі дзіцяці, правы і абавязкі жанчыны-маці ў межахтрадыцыйнай культуры.

Такім чынам, вясельная і радзінна-хрэсьбінная абраднасць беларусаў прадстаўлена звычаямі, вераваннямі, якія ўмацоўвалі адносіны з суседзямі, сваякамі, сябрамі. Веданне і дэталёвае выкананне традыцыйных сямейных звычаяў і абрадаў выконвала немалаважную ролю ў фарміраванні думкі аднавяскоўцаў пра сям'ю. Гэта меркаванне перадавалася ад пакалення пакаленню і адбівалася на лёсе дзяцей, унукаў. Акрамя таго ў народзе верылі, што выкананне ўсіх абрадавых дзеянняў ўплывае на далейшы лёс дзіця, маладую пару, багацце сям'і, яе здароўе і дабрабыт.

**Мэта даследчай работы**: выявіць, вывучыць і ахарактарызаваць асаблівасці вясельных і радзінна-хрэсьбінных абрадаў, вызначыць агульныя і адметныя асаблівасці на прыкладзе матэрыялаў поўначы Магілеўскай вобласці.

**З пастаўленай мэты вынікаюць наступныя задачы:**

1. прасачыць гісторыю развіцця вясельнага і радзінна-хрэсьбіннага абрадаў на Магілёўшчыне з іх адлюстраваннем у даследаваннях;
2. зрабіць апісанне традыцыйнай фіксацыі шлюбу беларусаў і правесці аналіз яго асноўных этапаў: перадвясельнага, уласна вясельнага і паслявясельнага;
3. знайсці падабенствы і адрозненні паўночна-магілёўскага вяселля на розных этапах яго правядзення ад іншых беларускіх варыянтаў;
4. вызначыць асноўныя рысы і этапы радзінна-хрэсьбіннай абраднасці беларусаў на прыкладзе поўначы Магілёўшчыны;
5. даследаваць, сістэматызаваць і апісаць агульныя і адметныя асаблівасці элементаў вясельных і радзінна-хрэсьбінных звычаяў і абрадаў па матэрыялах этнаграфічных экспедыцый.

**Аб'ектам даследавання** выступаюць прадстаўнікі беларускага этнасу, якія пражываюць у сельскай мясцовасці і не страцілі сваіх ведаў пра традыцыйныя сямейныя абрады і звычаі.

**Прадмет даследавання:** беларускія традыцыйныя звычаі і вераванні вясельнай і радзінна-хрэсьбіннай абраднасці паўначнага рэгіёну Магілеўскай вобласці.

**Крыніцамі** дысертацыйнага даследавання з'яўляюцца матэрыялы этнаграфічных экспедыцый, праведзеных на Шклоўшчыне, матэрыялы перыядычнага друку, публіцыстыка.

**Тэарэтычная значнасць:** праведзеная праца дазволіць змястоўна звярнуць увагу грамадства на выпрацоўку неабходных падыходаў па захаванні традыцыйнай абраднасці беларусаў у перыяд супярэчлівай і пагрозлівай для нацыянальных культур глабалізацыі. У выніку чаго, у традыцыйнай культуры павялічацца шанцы ў напрамку захавання нацыянальнай ідэнтычнасці і паглыблення нацыянальнай самасвядомасці.

**Практычная значнасць:** матэрыялы даследавання могуць выкарыстоўвацца пры паглыбленым вывучэнні сямейнай абраднасці ў рэгіёнах Магілеўшчыны. Вынікі даследавання будуць актуальны ў сферы пашырэння і прапаганды беларускіх нацыянальных традыцый праз

рэканструкцыі сямейных абрадаў на Шклоўшчыне, пры падрыхтоўцы і правядзенні ўрокаў гісторыі і краязнаўства, стварэнні падручнікаў, метадычных дапаможнікаў і вучэбных праграм. Матэрыялы з дадзенага даследавання выкарыстоўваліся пры распрацоўцы цыкла інтэрактыўных заняткаў “З крыніц спрадвечных” для вучняў УА “Гімназія № 1 г. Віцебска імя Ж. І. Алферава”, а таксама пры арганізацыі дабрачынных мерапрыемстваў па вывучэнні беларускай традыцыйнай культуры ва УК “Шклоўскі раённы-гісторыка-краязнаўчы музей”.

**Актуальнасць работы**: вясельныя і радзінна-хрэсьбінныя абрады застаюцца самым папулярнымі і самымі важнымі рытуаламі жыцця сучасных беларусаў. Аднак, гэтыя абрады сёння перажываюць розныя змены: светапогляднага, структурнага, ідэалагічнага характару. Таму даследаванне абрадаў і звычаяў, звязаных з вяселлем, радзінамі і хрэсьбінамі падобнага роду ўяўляецца вельмі своечасовым.

**Элементы навуковай навізны:** праведзены падрабязны структурна-функцыянальны аналіз вясельных і радзінна- хрэсьбінных абрадаў на поўначы Магілеўскай вобласці, прааналізаваны падабенствы і адрозненні сучаснага і традыцыйнага вяселля ў дадзеным рэгіёне.

**Храналагічныя рамкі** даследавання ахопліваюць перыяд канца XIX - пачатку XXI ст.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі:** 1. Международная научно-практическая конференция студентов, аспирантов и молодых ученых “XII Машеровские чтения”, ВГУ имени П. М. Машерова, Витебск, 19 октября 2018 г. 2. Международная научная конференция “Романовские чтения – 12”, посвященная 105-летию МГУ имени А. А. Кулешова, Могилев, 25-26 октября 2018 г., 3. Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Капыцінскія чытанні-3”, МДУ імя А. А. Куляшова, 28 лютага – 1 сакавіка 2019 года, Магілёў, 2019 г., 4. Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Куляшоўскія чытанні”, МДУ імя А. А. Куляшова, Магілеў, 18 – 19 красавіка 2019 г., 5. VII Международная научно-практическая конференция студентов и магистрантов “Молодость. Интеллект. Инициатива”, ВГУ имени П.М. Машерова, Витебск, 18 апреля 2019 г., 6. V Республиканская научно-практическая конференция “Научно-методическое сопровождение повышения квалификации педагогов: опыт, проблемы, перспективы”, МГОИРО, г. Могилёв, 17 мая 2019 г., 7. Международная научно-практическая конференция студентов, аспирантов и молодых учёных “XIII Машеровские чтения”, ВГУ имени П. М. Машерова, Витебск, 18 октября 2019 г. 8. Международная научная конференция “Романовские чтения-3”, МГУ имени А. А. Кулешова, Могилев, 28-29 ноября 2019 г.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

1. Кроцікава, М. В. Асаблівасці беларускага вясельнага абраду // Кроцікава М.В / XII Машеровские чтения: материалы международной научно-практической конференции студентов, аспирантов и молодых ученых, Витебск, 19 октября 2018 г. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: И.М. Прищепа (гл. ред.) [и др.]. - Витебск: ВГУ имени П. М. Машерова, 2018. - С. 98-100

2. Кроцікава, М.В. Сімволіка беларускіх вясельных атрыбутаў і іх сакральнае значэнне // Кроцікава М.В /Романовские чтения – 13 : сборник статей Международной научной конференции, посвященной 105-летию МГУ имени А. А. Кулешова, Могилев, 25-26 октября 2018 г. / под общ. ред. А. С. Мельниковой. – Могилев: МГУ имени А. А. Кулешова, 2019. – С.116-117.

3. Кроцікава, М.В. Вясельны каравай – сімвал яднання і працягу роду: паслядоўнасць абрадавых дзеянняў і іх значэнне // Кроцікава М. В./ Матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі Капыцінскія чытанні-3, 28 лютага - 1 сакавіка 2019 года, Магілёў, 2019. - МДУ імя А.А. Куляшова. - С.72-75

4. Кроцікава, М.В. Роля беларускіх народных традыцый, абрадаў і звычаяў у сучасным грамадстве ва ўмовах глабалізацыі // Кроцікава М.В./ Матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Куляшоўскія чытанні", Магілеў, 18 – 19 красавіка 2019 г.- "Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А. Куляшова". (Зборнік знаходзіцца ў друку)

5. Кроцікава, М.В. Перадвясельныя зборы жаніха і нявесты: асаблівасці правядзення рытуальных дзеянняў і іх значэнне // Кроцікава М. В. / Молодость. Интеллект. Инициатива:материалы VII Международной научно-практической конференции студентов и магистрантов, Витебск:18 апреля 2019 г./ Витеб. гос. ун-т; редкол.: И.М. Прищепа (гл.ред.). - Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2019.- С.111-113.

6. Кроцікава, М.В. Традыцыйная народная культура як сродак маральнага выхавання школьнікаў // Кроцікава М.В./ материалы V Республиканской научно-практической конференции "Научно-методическое сопровождение повышения квалификации педагогов: опыт, проблемы, перспективы", 17 мая 2019 года, г. Могилёв / редкол.: М. Жудро и др., под общей редакцией В.Н. Гириной. – Могилев, МГОИРО, 2019.- С.199

7. Кроцікава, М.В. Захаванне беларускай традыцыйнай культуры ў сучасным грамадстве ва ўмовах глабалізацыі // Кроцікава М. В / XIII Машеровские чтения: материалы международной научно-практической конференции студентов, аспирантов и молодых ученых, Витебск, 18 октября 2019 г. / Витеб. гос. ун-т; редкол.: И. М. Прищепа (гл. ред.) [и др.]. – Витебск: ВГУ имени П. М. Машерова, 2018. – С. 98-100

8. Кроцікава, М.В. Уплыў працэсаў глабалізацыі на стан нацыянальнай культуры // Кроцікава М. В. /Романовские чтения – 14: сборник статей Международной научной конференции, Могилев, 27-28 ноября 2019 г. – Могилев: МГУ имени А. А. Кулешова, 2019. – с. (Зборнік знаходзіцца ў друку)

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з 4 глаў, кожная з якіх мае ўнутраную структуру і ўтрымлівае падраздзелы. Асноўны тэкст займае 76 старонак, з бібліяграфічным спісам і дадаткамі – 104.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Барыс, С. В. Сцежкамі дзядоў: народны быт беларусаў/ С. В. Барыс. - Мінск: Беларуская навука, 2015. - 295 с.

2. Барыс, С. Вясельная сімволіка // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. - 1982. - № 3. - С. 34 - 36.

3. Барыс, С. Якім было беларускае вяселле // Краязаўчая газета. - 2017.- № 30. - С. 7.

4. Белорусы.- Мінск: Наука, 1998. - 503 с.

5. Буёнок, А. Народные обряды и праздники/А. Буёнок. -Санкт-Петербрг: Тригон, 2004. -383 с.

6. Бялявіна, В. М.Святы/В. М. Бялявіна [і інш.]//Беларусы.-т. 6: Грамадскія традыцыі/ В. Ф. Бацяеў [і інш.]; рэдкал. В. Ф. Бялявіна [і інш.]. - Мінск: Беларуская навука, 2002.-606 с.

7. Валатоўская, Н. А. Традыцыйны і сучасны вясельны абрад беларусаў і ўкраінцаў / Н. А. Валатоўская // Народная асвета. - 2013. - № 5. - С. 88 - 91.

8. Весялуха, М. "Прывезлі нявесту, як сонца...": Беларускае вяселле: традыцыі і забабоны / Марына Весялуха // Звязда. – 2016. - 14 кастрычніка. - С. 5.

9. Виноградова, Л. Н. Венок/ Л. Н. Виноградова, С. М. Толстая// Славянские древности/под ред. Н.И.Толстого. - Москва: Международные отношения,1995. - 584 с.

10. Вяселле: абрад / уклад., уступ. артыкул і камент. К. А. Цвіркі; муз. дадатак З. Я. Мажэйка.- Мінск: Навука і тэхніка, 1978. - 640 с.

11. Вяселле: абрад.- 2-е выд.- Мінск: Беларуская навука, 2004. - 683 с.

12. Вяселле: песні: у 6 кн. Кн 1. / склад. Л. А. Малаш; муз. дадат. З. Я. Мажэйка; рэд. А. С. Фядосік.- Мінск: Навука і тэхніка, 1980. - 680 с.

13. Вяселле: песні: у 6 кн. Кн. 4 / склад. Л. А Малаш. - Мінск: Навука і тэхніка, 1985.- 733 с.

14. Вяселле: песні: у 6 кн. Кн. 5 / склад. Л.А. Малаш.-Мінск: Навука і тэхніка, 1986. - 708 с.

15. Вяселле: песні: у 6 кн. Кн. 6 / склад. Л.А. Малаш.-Мінск: Навука і тэхніка, 1988. - 656 с.

16. Гура, А. В. Каравай / А.В. Гура //Славянские древности: словарь в 5 т./под ред.И.И. Толстого.-Москва: Международные отношения, 1999. - 704 с.

17. Даль, В. И.Толковый словарь русского языка. Современная версия/В. И. Даль.- Москва:Эксмо-пресс, 2000. - 736 с.

18. Дорахава, В. Пара заглядаць у будучыню: пра беларускія абрады і традыцыі расказвае этнограф Я. Крук / Вікторыя Дорахава // Беларусь. – 2013. - № 1. - С. 14 – 15.

19. Казакова І. Жанчына ў беларускай сямейнай абраднасці/ Ірына Казакова//Роднае слова. - 2008. - № 5. - С. 97 – 98.

20. Казакова, І. В. Традыцыйная сямейная абраднасць беларусаў: вясельны абрад / Казакова І. В. // Народная асвета. – 2007. - № 9. – С. 84 – 88.

21. Казакова, І. В. Традыцыйная сямейная абраднасць беларусаў: нараджэнне. Радзіны. Хрышчэнне. / Казакова І.В.// Народная асвета. —2007. - №5. - С. 85 - 88.

22. Казакова, І. В. Традыцыйная сямейная абраднасць беларусаў: пахаванне, ушанаванне продкаў / Казакова І.В. // Народная асвета. - 2007. - №11. - С. 72 – 76.

23. Казакова, І. Жанчына ў беларускай сямейнай абраднасці / Ірына Казакова // Роднае слова. - 2008. - № 5. – С. 97 - 98

24. Казакова, І. На парозе жыцця: агульнасць сімволікі сямейна- абрадавага комплексу беларусаў / Ірына Казакова // Роднае слова. - 2009. - № 1. – С. 96 – 99.

25. Казакова, І. Этнічныя традыцыі ў духоўнай культуры беларусаў / Казакова І.В.– Мінск: Універсітэцкае, 1995. – 151 с.

26. Калачова, І. Ад традыцый да інавацый: гарадская сям'я беларусаў у апошняй трэці XX – пачатку XXI стагоддзя / Ірына Калачова // Беларуская думка. - 2010. - № 6. - С. 61 - 65.

27. Калачова, І. Этнакультурныя працэсы ў гарадской сям'і беларусаў у апошняй трэці XX – пачатку XXI ст. / І. І Калачова. –Мінск: Беларуская навука, 2009. – 266 с.

28. Карский, Е.Ф. Белорусы: Очерки словесности белорусского племени/ Е.Ф. Карский.- Минск: БелЭн, 2007. - 584 с.

29. Карскі, Я. Беларусы/Я. Карскі. - Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001. - 640 с.

30. Каспяровіч, В. Сімвалы беларускага вяселля // Роднае слова. - 2005. - № 4. – С. 98 – 102.

31. Корбут, В. Каханне ды згода, ці некалькі штрыхоў да вясельных традыцый / Віктар Корбут // Беларусь. – 2006. - № 3. – С. 28 – 29.

32. Котович, О. В. Белорусская свадьба в пространстве традиционной культуры / Оксана Котович, Янка Крук. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2012. – 848 с.

33. Крук Я. Сімволіка беларускай народнай культуры / І.І. Крук.-Мінск:Беларусь, 2011.- 430 с.

34. Крук Я. Сімволіка колераў у традыцыйнай культуры беларусаў/І.І. Крук//Роднае слова. - 1997. - №1.- С.144 -160.

35. Крук, І. "Сячыся, рубайся, і на гэты свет, младзенец, яўляйся": Роды і стаўленне да іх

у культуры нашых продкаў // Роднае слова. - 1999. - № 5 - 6. - С. 199 – 205.

36. Крук, І. “Я не адна, са мной мой другі”: Цяжарная жанчына і ўспрыманне яе у культуры нашых продкаў // Роднае слова. - 1999. - №2. - С.199 – 206.

37. Крук, Я. Таинство рождения в традиционных воззрениях белорусов// Неман. -2001.- №2. - С. 221 – 236.

38. Крук, Я. Традиционная белорусская свадьба / Янка Крук // Нёман. – 2000. - № 8. – С. 202 – 225.

39. Кухаронак, Т. “Калі на свет дзіця прыходзіць, новы кусок хлеба родзіць”: Роды і стаўленне да іх у традыцыйнай культуры беларусаў // Роднае слова. - 1999. - №4. - С.189 - 193.

40. Кухаронак, Т. “Кумы мае ўлюбленыя…”: Выбар кумоў у традыцыйнай культуры беларусаў//Роднае слова. -2000.-№2.- 103 -104

41. Кухаронак, Т. “Люлі, люлі, малое, каб на лета другое…”: Абрадавыя дзеянні працягу першага года жыцця дзіцяці ў традыцыйнай культуры беларусаў// Роднае слова. -2000-№11.-С.105-106

42. Кухаронак, Т. “У нашай Кацярынкі – штогод хрэсьбіны ды радзінкі”: Хрэсьбіны ў традыцыйнай культуры беларусаў//Роднае слова. -2000.- №6.- С. 98 – 99.

43. Кухаронак, Т. Ля калыскі тры долі стаялі: Адведкі ў традыцыйнай беларускай культуры//Роднае слова. -1999.-№10. - С. 204-206

44. Кухаронак, Т. Радзінныя звычаі і абрады беларусаў: канец XIX-XX ст.-Мінск: Навука і тэхніка, 1993. - 126 с.

45. Кухаронак, Т. Радзіны і маленства ў традыцыйнай культуры беларусаў - Т. І. Кухаронак. – Мінск: Беларуская навука, 2017. – 140 с.

46. Кухаронак, Т. Чакаючы дзіця: Цяжарная жанчына: стаўленне да яе да яе ў традыцыйнай культуры беларусаў// Роднае слова. -1999.-№2.-С.190-194.

47. Народные традиции и обрядность в торжественной регистрации брака и рождения. Новые формы организации проведения торжеств // Юстыцыя Беларусі. - 2007.-№11.-С.13 – 16.

48. Никольский, Н. М. Происхождение и история белорусской свадебной обрядности / Н.М. Никольский. – Минск: Академия Наук БССР, 1956 . – 270 с.

49. Палесскае вяселле. – Мінск: Універсітэцкае, 1984. – 303 с.

50. Пилипенко, М. Ф. Этнография Беларуси / М.Ф. Пилипенко. – Минск: Высшая школа, 1981.- 192 с.

51. Піваварчык, І. “Ідзе маладая, як сонца”: знакава-сімвалічны аналіз вясельнага ўбрання // Роднае слова. – 2002. - № 12. – С. 29 – 32.

52. Радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі беларусаў (на матэрыяле фальклору

Гомельскай вобласці) /аўтары-ўкладальнікі Новак В. С.– Гомель: Барк, 2013. – 380 с.

53. Радзінная паэзія (пад рэд. Цітовіч Г.І.) - Мінск: Навука і тэхніка, 1971.-784 с.

54. Ракава, Л. Сваякі: традыцыйная сям'я ў беларусаў / Любоў Ракава // Алеся. – 2008. - № 12. – С. 16 – 17.

55. Сысоў, І. М. З крыніц спрадвечных. - Мінск: Вышэйшая школа, 1997.- 440 с.

56. Титовец, А. В.Традиционная культура белорусов во времени и пространстве / А. В. Титовец [и др.]; под ред. А. В. Титовца. – Минск: Беларуская навука, 2013. – 579 с.

57. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. Т. 1. Магілеўская Падняпроўе / Т. Б. Варфаламеева, В. І. Басько, М. А. Козенка і інш. – Мінск: Беларуская навука, 2001. – 797 с.

58. Федароўскі, М. Люд беларускі. Вяселле / М. Федароўскі. – Мінск: Полымя, 1991. – 142 с.

59. Фядосік, А. Беларускае вяселле. Сватанне / А. Фядосік // Роднае слова.- 2003. - № 7. - С. 102 – 105.

60. Фядосік, А. Заручыны ў традыцыйнай беларускай вясельнай абраднасці / Анатоль Фядосік // Роднае слова. – 2006.- № 2. – С. 99-100.

61. Яцкевіч, Т. Вярбовы корчык, або чаму нельга гушкаць пустую калыску//Беларуская мінуўшчына. -1995.-№4.- С. 56 – 58

**Архіў аўтараў**

1. **АА 1** Букетава Ганна Трафімаўна, 1927 г. н., Гарадзец Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці.

2. **АА 2** Быкава Зінаіда Цімафееўна, 1929 г. н., в. Гарадзец Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці.

3. **АА 3** Кроцікава Аляксандра Афанасьеўна, 1937 г. н., в. Гарадзец Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці.

4. **АА 4** Кроцікаў Аляксандр Афанасьевіч, 1938 г. н., в. Гарадзец, Шклоўскага раёна, Магілеўскай вобласці.

5. **АА 5** Пабядзінская Аляксандра Іванаўна, 1930 г.н., в. Гарадзец Шклоўскага раёна Магілеўскай вобласці.

6. **АА 6** Шалаева Марыя Малахаўна, 1928 г. н. в. Гарадзец Шклоўскага раёна Магілеўскай вобласці.

7. **АА 7** Шалашэнь Ганна Віктараўна, 1929 г. н., в. Гарадзец Шклоўскага раёна Магілеўскай вобласці.

8. **АА 8** Шараёва Валянціна Іванаўна, 1949 г. н., в. Гарадзец Шклоўскага раёна Магілеўскай вобласці.